**Заданне 12.** Як на гісторыі Беларусі адбілася галоўная асаблівасць яе геапалітычнага становішча – знаходжанне на стыку заходнеўрапейскай і ўсходнеславянскай цывілізацый?

Витебский государственный технологический университет

*** Заданне 13.** Прачытайце тэкст “Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь” (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 9 лістапада 2010 г.) і вызначце супярэчнасці сучаснага свету, якія пагражаюць бяспецы нашай дзяржавы.

Витебский государственный технологический университет

## ТЭМА 14. КАНСТЫТУЦЫЯ ЯК АСНОЎНЫ ЗАКОН ДЗЯРЖАВЫ

**Заданне 1.** Якія традыцыі складання і выкарыстання агульных для ўсяго насельніцтва прававых актаў мае Беларусь?

**Заданне 2.** Дайце азначэнне наступным тэрмінам і паняццям:

Дакументы заканадаўства

Закон

Звычаёвае права

Канстытуцыя

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 3.** Што такое “Руская праўда”? Ці аказала яна уплыў на мясцовае звычаёвае права? Свой адказ аргументуйце.

**Заданне 4.** У якіх граматах і дагаворах можна знайсці запісы звычаёвага права Беларусі?

**Заданне 5.** Пералічыце характэрныя асаблівасці “Судзебніка Казіміра” 1468 г. Якія з яго прынцыпаў пазней былі ўключаны ва Усеагульную Дэкларацыю Правоў Чалавека?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 6.** Колькі было прынята Статутаў ВКЛ? Назавіце гады іх прыняцця.

**Заданне 7.** Пералічыце характэрныя асаблівасці ІІІ-га Статута ВКЛ. У чым заключаецца яго выдатная роля ў развіцці заканадаўчай базы на беларускіх землях? Да якога часу ім карысталіся на тэрыторыі Беларусі?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 8.** Калі і дзе была прынята першая Канстытуцыя Еўропы? Пералічыце яе адметныя асаблівасці.

**Заданне 9.** Якія асаблівасці мелі савецкія Канстытуцыі БССР 1919, 1927, 1937 і 1978 гг.?

**Заданне 10.** Якое значэнне мела Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР для развіцця беларускай дзяржаўнасці?



Витебский государственный технологический университет

**Заданне 11.** Калі і пры якіх абставінах была прынята Канстытуцыя суверэннай Беларусі? У чым заключаліся змены і дапаўненні, унесеныя ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь у 1996 г.?

**Заданне 12.** Чым была выклікана неабходнасць прыняцця новай Канстытуцыі ў Рэспубліцы Беларусь у 2022 г.? Якія змены былі ў яе ўнесены?

Витебский государственный технологический университет

*** Заданне 13.** Ці патрэбна, на Вашу думку, далейшае ўдасканаленне зместу Канстытуцыі? Свой адказ аргументуйце.

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 14.** Патлумачце, чаму менавіта чалавек, яго правы, свабоды і гарантыя іх рэалізацыі з'яўляецца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства?

* **Заданне 13.** Абазначце іерархію нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь.

Витебский государственный технологический университет

## ТЭМА 15. ПРЭЗІДЭНТ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Заданне 1.** Якую ролю ў развіцці дзяржаўнасці на беларускіх землях адыграў інстытут кіраўніка дзяржавы? Свой адказ падмацуйце прыкладамі.

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 2.** Якія функцыі выконваў кіраўнік дзяржавы ў часы існавання Полацкага княства?

**Заданне 3.** Чаму князь часта надзяляўся сакральнымі рысамі і звышнатуральнымі ўласцівасцямі? Пра што гэта сведчыць?

Витебский государственный технологический университет

*** Заданне 4.** Чаму менавіта вялікі князь Вітаўт у беларускім фальклоры выступае як тыпова міфалагізаваны персанаж, эпічная, сакральная асоба?

**Заданне 5.** Як тэрмін "прэзідэнт" перакладаецца з лацінскай мовы?

**Заданне 6.** Чым характаразуецца манархічная форма праўлення?

**Заданне 7.** Для якіх перыядаў у гісторыі Беларусі характэрны абсалютная і абмежаваная манархіі?



Витебский государственный технологический университет

**Заданне 8.** Якія асаблівасці мела арганізацыя кіравання дзяржавай у савецкі час?

**Заданне 9.** Калі і пры якіх абставінах Беларусь стала прэзідэнцкай рэспублікай?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 10.** Які парадак выбараў Прэзідэнта зацверджаны ў нашай краіне?

**Заданне 11.** Якія функцыі і паўнамоцтвы належаць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 12.** Як рэалізуюцца паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь як Галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі?

*** Заданне 13.** Чаму менавіта прэзідэнцкая рэспубліка найбольш адпавядае асаблівасцям развіцця нашай краіны і менталітэту яе насельніцтва?

Витебский государственный технологический университет

## ТЭМА 16. УРАД ЯК ВЫШЭЙШЫ ОРГАН ВЫКАНАЎЧАЙ УЛАДЫ

**Заданне 1.** Дайце азначэнне наступным тэрмінам і паняццям:

Цівун ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Пасаднік ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Даніна ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Кармленне ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Палюддзе ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Верв ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Рада ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Тысяцкі ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Стараста ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Отракі ________________________________________________

________________________________________________

________________________________________________

Витебский государственный технологический университет

Дзецкія ___________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

**Заданне 2.** Якім чынам былі арганізаваны ўлада і кіраванне на беларускіх землях у перыяд сярэднявечча?

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

___________________________________________________________

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу "Цэнтральны аппарат кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім"?

| Пасада | Функцыі |
|---|---|
| Канцлер | |
| Падканцлер | |
| Падскарбі земскі | |
| Падскарбі дворны | |
| Гетман вялікі | |
| Гетман польны | |
| Кашталян | |
| Маршалак земскі | |

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 4.** Калі на беларускіх землях з’явілася міністэрская форма кіравання? У чым яе асаблівасць?

**Заданне 5.** Прывядзіце прыклады выхадцаў з беларускіх зямель, якія займалі вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў Расійскай імперыі? * Пра аднаго з іх падрыхтуйце рэферат.

**Заданне 6.** Што ўяўляў сабой урад БССР? У чым заключаліся асаблівасці яго становішча, якія фунцыі ён выконваў?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 7.** Як ажыццяўляецца фарміраванне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь? Якую ён мае структуру?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 8.** Якія функцыі выконвае ўрад сучаснай Рэспублікі Беларусь?

**Заданне 9.** Складзіце схему арганізацыі выканаўчай улады ў Рэспубліцы Беларусь.

**Заданне 10.** Наколькі, на Вашу думку, залежыць эфектыўнасць працы ўрада ад асобы, якая яго ўзначальвае?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 11.** Расстаўце кіраўнікоў беларускага ўрада ў храналагічнай паслядоўнасці: М. Мясніковіч, М. Чыгір, С. Румас, С. Лінг, Р. Галоўчанка, В. Кебіч, У. Ярмошын, С. Сідорскі, Г. Навіцкі, А. Кабякоў.

***Заданне 12.** Азнаёмцеся са зместам Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. № 424-З "Аб Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь". На якія галіны жыцця краіны распаўсюджваюцца паўнамоцтвы беларускага ўрада (Артыкулы 11–23)? Як размяжоўваюцца паўнамоцтвы Савета Міністраў, Прэзідэнта і асобных міністэрстваў?

Витебский государственный технологический университет

## ТЭМА 17. ЗАКАНАДАЎЧАЯ І СУДОВАЯ ГАЛІНЫ ЎЛАДЫ. ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ І ГРАМАДСКІЯ АБ’ЯДНАННІ

**Заданне 1.** Дайце азначэнне наступным тэрмінам і паняццям:

Веча

Вальны сойм

Генеральны соймік

Рэляцыйны соймік

Пасольская ізба

Сенат

Віленская канвакацыя

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 2.** Якія пласты насельніцтва прымалі ўдзел ў вечы і сойме? Якія паўнамоцтвы мелі гэтыя органы?

**Заданне 3.** Якім было прадстаўніцтва з беларускіх зямель у Дзяржаўных думах Расійскай імперыі? Якія пытанні выклікалі найбольшую цікавасць і абмеркаванне?



Витебский государственный технологический университет

**Заданне 4.** У чым заключаліся асаблівасці савецкай формы народнага прадстаўніцтва? Якія паўнамоцтвы меў Вярхоўны Савет?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 5.** У чым асаблівасці фарміравання, арганізацыі работы і структуры Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь?

**Заданне 6.** Якія функцыі выконваюць і якія паўнамоцтвы маюць Савет Рэспублікі і Палата прадстаўнікоў?

Витебский государственный технологический университет

***Заданне 7.** Запоўніце табліцу ”Судовая сістэма ВКЛ”.

| Назва суда | Прызначэнне суддзяў | Якія справы разглядаліся |
|---|---|---|
| Вялікакняскі (Галоўны Літоўскі трыбунал) | | |
| Ваяводскі | | |
| Земскі | | |
| Гродскі | | |
| Падкаморскі | | |
| Войтаўска-лаўніцкі | | |

Витебский государственный технологический университет

| | | |
|---|---|---|
| Копны | | |
| Вотчынны | | |

**Заданне 8.** Якія віды судоў існуюць у сучаснай Рэспубліцы Беларусь? Якія функцыі на іх ускладзены?

**Заданне 9.** У чым заключаюцца паўнамоцтвы Вярхоўнага і Канстытуцыйнага судоў Рэспублікі Беларусь? Як адбываецца фарміраванне іх асабовага складу?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 10.** Калі ў Беларусі ўзніклі першыя палітычныя партыі? Якія мэты яны ставілі?

**Заданне 11.** Якую праграму мела першая беларуская нацыянальная партыя – Беларуская сацыялістычная грамада?

**Заданне 12.** Калі і як у гісторыі Беларусі адбыўся пераход ад аднапартыйнай да шматпартыйнай сістэмы?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 13.** Што ўяўляе сабой нарматыўна-прававая база дзейнасці партый і грамадскіх аб'яднанняў?

**Заданне 14.** Як па свайму палітычнаму спектру падзяляюцца палітычныя партыі Рэспублікі Беларусь?



Витебский государственный технологический университет

**Заданне 15.** Якія грамадскія аб'яднанні зарэгістраваны ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь? Якія з іх найбольш масавыя?

**Заданне 16.** Якая роля належыць партыям і грамадскім аб'яднанням у развіцці беларускага грамадства і дзяржавы?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 17.** Якую будучыню ў партыйным будаўніцтве Рэспублікі Беларусь можна спрагназаваць?

**Заданне 18.** Выкажыце ўласнае меркаванне. Ці патрэбна нашаму грамадству кіруючая палітычная партыя?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 19.** Якая роля належыць партыям і грамадскім аб'яднанням у развіцці беларускага грамадства і дзяржавы?

**Заданне 20.** Якія перавагі і недахопы і ў якіх абставінах маюць аднапартыйная і шматпартыйная сістэмы? Прывядзіце прыклады з гісторыі?

Витебский государственный технологический университет

***Заданне 21.** Азнаёмцеся са Статутам Рэспубліканскага грамадскага аб’яднання “Белая Русь” і на яго падставе складзіце схему кіруючых структур гэтай арганізацыі. Якія мэты яна ставіць і якімі кампетэнцыямі валодае?

Витебский государственный технологический университет

## ТЭМА 18. РЭГІЁНЫ БЕЛАРУСІ

**Заданне 1.** Дайце азначэнне наступным тэрмінам і паняццям:

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

Воласць

Зямля

Павет

Ваяводства

Староства

Каралеўская эканомія

Графства

Ардынацыя

Губерня

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 2.** На якія тэрытарыяльная адзінкі падзяляліся беларускія землі ў часы Старажытнай Русі? Якім чынам там ажыццяўлялася кіраванне?

**Заданне 3.** Якія трансфармацыі адбываліся ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні Вялікага Княства Літоўскага?



Витебский государственный технологический университет

**Заданне 4.** На якія адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі падзяляліся беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі?

**Заданне 5.** Якія змены адбываліся ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні БССР у 1919–1991 гг.?

Витебский государственный технологический университет

**Заданне 6.** Што ўяўляе сабой адміністрацыйна-тэрытарыяльная структура сучаснай Рэспублікі Беларусь?

Витебский государственный технологический университет

*** Заданне 7.** Якім чынам арганізавана мясцовае кіраванне і самакіраванне ў сучаснай Беларусі?

**Заданне 8.** Якія функцыі выконваюць і якія паўнамоцтвы маюць сучасныя органы мясцовага кіравання і самакіравання?

***Заданне 9.** Які адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь, на Вашу думку, больш рацыянальны для нашай дзяржавы?

Витебский государственный технологический университет

*** Заданне 10.** Пры дапамозе карт “Вялікага гістарычнага атласа” прасачыце змены межаў дзяржаўных утварэнняў, існаваўшых на беларускіх землях, і выкажыце меркаванні наконт асаблівасцей фарміравання сучаснай дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь.

Витебский государственный технологический университет

## ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

1. Папярэднікі індаеўрапейцаў на тэрыторыі Беларусі:
1) славяне;
2) балты;
3) фіна-угры;
4) готы.

2. Балты – гэта:
1) адна з галін індаеўрапейцаў;
2) адно са славянскіх плямянаў;
3) вынік асіміляцыі славянамі готаў;
4) вынік асіміляцыі індаеўрапейцамі сарматаў.

3. Гідронімы – гэта:
1) назва прылад працы;
2) назва мясцовасці;
3) назва водных аб'ектаў;
4) група археалагічных культур.

4. Крывічы рассяліліся ў
1) Падзвінні;
2) Верхнім Падняпроўі;
3) Пасожжы;
4) Верхнім Панямонні.

5. Радзімічы рассяліліся ў
1) басейне р. Сож;
2) басейне р. Нёман;
3) басейне р. Прыпяць;
4) басейне р. Заходняя Дзвіна і Днепр.

6. Аўтарам "крывіцкай" канцэпцыі паходжання беларусаў з'яўляецца?
1) Сядоў;
2) Карнейчык;
3) Доўнар-Запольскі;
4) Ластоўскі.

7. Фарміраванне феадальных адносін на Беларусі адбывалася?
1) сінтэзным шляхам;
2) бязсінтэзным шляхам;
3) самастойным шляхам;
4) "прускім" шляхам.

Витебский государственный технологический университет

8. Спосаб збору даніны князем з насельніцтва, што пражывала на падуладнай яму тэрыторыі:
1) падатак;
2) аброк;
3) даніна;
4) палюддзе.

9. Натуральны падатак, які плаціла князю падуладнае насельніцтва:
1) аброк;
2) даніна;
3) палюддзе;
4) дзякла.

10. Умацаваны валамі, равамі, сценамі цэнтр старажытнага горада:
1) пасад;
2) дзядзінец;
3) крэпасць;
4) гарадзішча.

11. У канцы IX ст. дамы у Полацку былі пабудаваны:
1) пераважна з камяню і цэглы;
2) толькі цэглы;
3) з камяню і дрэва;
4) толькі з дрэва.

12. Першыя летапісныя згадкі пра Полацк адносяцца да:
1) 862 г.;
2) 863 г.;
3) 864 г.;
4) 865 г.

13. Першы вядомы з летапісаў полацкі князь:
1) Рагвалод;
2) Уладзімір;
3) Ізяслаў;
4) Брачыслаў.

14. Веча – гэта:
1) форма выбараў вялікага князя жыхарамі дзяржавы;
2) судовая установа, якая разглядала апеляцыі на прысуд князя;
3) агульны сход дарослых мужчын горада і воласці для вырашэння найбольш важных грамадскіх і дзяржаўных спраў;
4) княскі дружыннік.

Витебский государственный технологический университет

15. Бітва на р. Нямізе
1) 1065 г.;
2) 1066 г.;
3) 1067 г.;
4) 1068 г.

16. Яраславічам у бітве на р. Нямізе супрацьстаялі войскі Полацкага княства на чале з:
1) Рагвалодам;
2) Ізяславам;
3) Усяславам;
4) Брачыславам.

17. Волакі – гэта:
1) сухапутныя шляхі зносін, якія ляжалі паміж рэкамі;
2) назва карабля;
3) людзі, што перацягвалі караблі па сушы з адной рэчкі на другую;
4) княскія слугі, што збіралі мыта.

18. Хрысціянства заснавана на:
1) монатэізме;
2) політэізме;
3) монатэізме і політэізме;
4) язычніцтве.

19. Полацкая епархія была ўтворана ў:
1) 988 г.;
2) 990 г.;
3) 992 г.;
4) 995 г.

20. У Беларусі распаўсюдзілася хрысціянства:
1) візантыйскага ўзору;
2) рымскага;
3) блізкаўсходняга, іерусалімскага;
4) александрыйскага.

21. Першая вядомая на Беларусі манахіня:
1) Ефрасіння Полацкая;
2) Рагнеда;
3) Вольга;
4) Марыя Віцебская.

Витебский государственный технологический университет

22. Хрысціянства ў Полацкім княстве распаўсюджвалася:
1) князь–дружына–гараджане–жыхары вёскі;
2) жыхары вёскі–князь–гараджане–дружына;
3) дружына–князь–гараджане–жыхары вёсак;
4) гараджане–жыхары вёсак–дружына–князь.

23. Насельніцтва Полацкага і Тураўскага княства на карысць царквы несла:
1) даніну;
2) чынш;
3) дзесяціну;
4) сярэбшчыну.

24. Сафійскі сабор збудаваны ў часы кіравання ў Полацку:
1) Рагвалода;
2) Ізяслава;
3) Брачыслава;
4) Усяслава.

25. У Тураве на Замкавай гары ў 1993 годзе быў адкрыты помнік:
1) князю Туру;
2) князю Святаполку;
3) князю Юрыю;
4) Кірыле Тураўскаму.

26. Да нашага часу захавалася:
1) вежа ў Камянцы;
2) вежа ў Мінску;
3) вежа ў Полацку;
4) вежа ў Гародні.

27. Першая жанчына, кананізаваная праваслаўнай царквой на землях ўсходніх славян:
1) Рагнеда;
2) Вольга;
3) Ефрасіня Полацкая;
4) Варвара, жонка князя Святаслава.

28. Словы: “Сладко бы медвежий сот и добро сахар, обоего же добре книгий разум: сие убо суть скровища вечныя жизни” належаць:
1) Кірыле Тураўскаму;
2) Кліменту Смаляцічу;
3) Аўрамію Смаленскаму;
4) Ефрасінні Полацкай.



Витебский государственный технологический университет

29. Асноўная небяспека для Полацкай зямлі ў к. XII – пач. XIII стст. зыходзіла:
1) ад мангола-татар;
2) варагаў;
3) крыжакоў.

30. “Чорная Русь” – гэта:
1) Беларускае Панямонне;
2) Беларускае Падняпроў’е;
3) Беларускае Падзвінне;
4) Беларускае Папрыпяцце.

31. Назва “Літва” упершыню ў пісьмовых крыніцах сустракаецца пад:
1) 1001 г.;
2) 1009 г.;
3) 1019 г.;
4) 1021 г.

32. Паскорыла ўтварэнне ВКЛ:
1) жаданне літоўцаў хутчэй аб’яднацца з суседзямі-славянамі;
2) знешняя небяспека з боку крыжакоў і мангола-татар;
3) развіццё рамяства і гандлю на сучасных беларускіх землях;
4) усведамленне балтамі шкоднасці перыяду феадальнай раздробленасці.

33. Першай сталіцай ВКЛ быў горад:
1) Вільня;
2) Крэва;
3) Навагрудак;
4) Полацк.

34. ВКЛ было дзяржавай:
1) федэратыўнай;
2) унітарнай;
3) аўтаномнай;
4) канфедэратыўнай.

35. Каранацыя Міндоўга адбылася ў:
1) 1251 г.;
2) 1253 г.;
3) 1254 г.;
4) 1255 г.

Витебский государственный технологический университет

36. За ўсю гісторыю ВКЛ тытул караля меў:
1) адзін кіраўнік дзяржавы;
2) два;
3) тры;
4) чатыры.

37. У тэрытарыяльным плане ВКЛ уяўляла сабою аб’яднанне:
1) балцкіх і ўсходнеславянскіх зямель;
2) балцкіх, германскіх і ўсходнеславянскіх зямель;
3) усходнеславянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх зямель;
4) балцкіх, польскіх і ўсходнеславянскіх зямель.

38. Этнічную аснову ВКЛ у пачатку яго існавання складалі:
1) балты і ўсходнія славяне;
2) балты і беларусы;
3) беларусы, рускія, украінцы, балты;
4) балты, беларусы, украінцы.

39. Перанос сталіцы ВКЛ з аднаго горада ў другі ажыццявіў:
1) Віцень;
2) Гедымін;
3) Вітаўт;
4) Казімір.

40. Вільня стала сталіцай ВКЛ у:
1) 1320 г.;
2) 1321 г.;
3) 1322 г.;
4) 1323 г.

41. На р. Сінія Воды войска ВКЛ разграміла:
1) маскоўскае войска;
2) татарскае войска;
3) крыжацкае войска;
4) польскае войска.

42. Віцебскае княства трапіла ў склад ВКЛ шляхам:
1) шлюбнага дагавору;
2) заваявання;
3) куплі-продажу;
4) падаравання.

43. Полацкая зямля канчаткова была ўключана ў склад ВКЛ у:
1) 1263 г.;



Витебский государственный технологический университет

2) 1287 г.;
3) 1297 г.;
4) 1307 г.

44. Крэўская унія была заключана паміж:
1) ВКЛ і Польшчай;
2) ВКЛ і Масквою;
3) ВКЛ і татарамі;
4) ВКЛ і Лівонскім ордэнам.

45. Права займаць дзяржаўныя пасады толькі феадалам католікам дараваў:
1) прывілей Ягайлы 1387 г.;
2) Гарадзельскі прывілей 1413 г.
3) прывілей Казіміра 1447 г.;
4) прывілей Аляксандра 1492 г.

46. Першай спробай кадыфікацыі права ў ВКЛ быў:
1) Гарадзельскі прывілей 1413 г.;
2) прывілей Казіміра 1447 г.;
3) Судзебнік Казіміра 1468 г.;
4) Статут 1558 г.

47. Манархічная ўлада ў ВКЛ эвалюцыяніравала:
1) ад неабмежаванай да саслоўна-прадстаўнічай;
2) ад саслоўна-прадстаўнічай да неабмежаванай;
3) ад самадзяржаўнай да канстытуцыйнай;
4) ад спадчыннай да выбарнай.

48. Сойм, як дзяржаўны орган улады, аформіўся ў:
1) канцы XIII ст.;
2) канцы XIV ст.;
3) канцы XV ст.;
4) канцы XVI ст.

49. Шляхта кожнага павета мела права выбіраць у сейм ВКЛ:
1) аднаго дэпутата;
2) двух;
3) трох;
4) чатырох.

50. Агульнадзяржаўныя соймы у ВКЛ мелі назву:
1) вальныя;
2) вялікакняскія;

Витебский государственный технологический университет

3) гаспадарскія;
4) вялікадзяржаўныя.

51. Першымі ваяводствамі ў ВКЛ сталі:
1) Полацкае;
2) Віцебскае;
3) Віленскае;
4) Трокскае.

52. Мовай дзяржаўнага справаводства ў ВКЛ была:
1) старабеларуская;
2) літоўская;
3) польская;
4) лацінская.

53. У канцы XIII–XIV стст. тэрыторыя ВКЛ падзялялася на:
1) удзельныя княствы;
2) ваяводствы;
3) паветы;
4) валасці.

54. На чале павета ў ВКЛ стаяў:
1) войт;
2) староста;
3) цівун;
4) камісар.

55. Вышэйшая судовая інстанцыя ў ВКЛ да 1581 г.:
1) вялікакняжацкі суд;
2) ваяводскі суд;
3) соймавы суд;
4) трыбунал.

56. Межавыя зямельныя спрэчкі шляхты ў ВКЛ разглядаў суд:
1) падкамісарскі;
2) падкаморскі;
3) вялікакняжацкі;
4) гродскі.

57. Галоўным палітычным сапернікам ВКЛ з канца XV ст. стала:
1) Крымскае ханства;
2) Маскоўская дзяржава;
3) Залатая Арда;
4) Шведскае каралеўства.

Витебский государственный технологический университет

58. Фарміраванню беларускай народнасці садзейнічала:
1) развіццё рамяства, гандлю, гарадоў;
2) падзел насельніцтва па канфесіянальнай прыкмеце;
3) супярэчнасці паміж феадаламі і сялянамі;
4) інтэрвенцыя крыжакоў.

59. Станаўленню беларускай мовы садзейнічала:
1) дзяржаўны статус у ВКЛ;
2) выданне на беларускай мове газет;
3) паланізацыя вышэйшага саслоў'я ў ВКЛ;
4) дзейнасць Брэсцкай друкарні ў 1550–1570 гг.

60. Люблінская унія была падпісана:
1) 1 ліпеня 1559 г.;
2) 1 ліпеня 1569 г.;
3) 1 ліпеня 1579 г.;
4) 1 ліпеня 1589 г.

61. Напярэдадні падпісання Люблінскай уніі да Польшчы былі далучаны землі ВКЛ:
1) Падолле і Кіеўшчына;
2) Жамойць;
3) Гродзеншчына;
4) Папрыпяцце.

62. Уніяцкая царква была падпарадкавана:
1) рымскаму папе;
2) уніяцкаму патрыярху;
3) канстанцінопальскаму праваслаўнаму патрыярху;
4) уніяцкаму мітрапаліту ў Маскве.

63. Рашаючая бітва ў ходзе казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. адбылася пад:
1) Гомелем;
2) Бабруйскам;
3) Лоевам;
4) Магілёвам.

64. Прычынай палітычнага крызісу РП стала:
1) адсутнасць моцнай цэнтралізаванай улады;
2) геаграфічнае становішча РП;
3) адсутнасць дапамогі з боку суседзяў.

Витебский государственный технологический университет

65. “Ліберум вета” – гэта:
1) права дэпутата сойма выказаць нязгоду з любой соймавай пастановай;
2) права шляхціча ўдзельнічаць ці не ўдзельнічаць у шляхецкім апалчэнні;
3) права дэпутата сойма патрабаваць адстаўкі караля;
4) права шляхты на свабоднае распараджэнне маёмасцю.

66. Расійскія ўлады пакінулі за беларуска-літоўскай шляхтай права:
1) абіраць манарха;
2) будаваць уласныя абарончыя замкі;
3) валодаць маёнткамі;
4) праводзіць павятовыя соймікі.

67. Сяляне і мяшчане Беларусі, пасля далучэння да Расійскай імперыі павінны былі плаціць дзяржаве:
1) падымны падатак;
2) падворны падатак;
3) падушны падатак;
4) падатак з кожнай сям’і.

68. У час далучэння да Расійскай імперыі асноўную колькасць хрысціян на беларускіх землях складалі:
1) каталікі;
2) праваслаўныя;
3) уніяты;
4) стараабрадцы.

69. Мяжа яўрэйскай аселасці ў Расійскай імперыі была ўведзена ў:
1) 1772 г.;
2) 1789 г.;
3) 1794 г.;
4) 1801 г.

70. Таварыства філаматаў было створана ў Віленскім універсітэце ў:
1) 1801 г.;
2) 1811 г.;
3) 1814 г.;
4) 1817 г.

71. Адным з заснавальнікаў таварыства філаматаў быў:
1) Т. Зан;
2) Я. Баршчэўскі;
3) С. Манюшка;
4) Ф. Савіч.

Витебский государственный технологический университет

72. Царкоўны сабор, які прыняў рашэнне аб далучэнні уніяцкай царквы да праваслаўнай, адбыўся ў:
1) Мінску;
2) Магілёве;
3) Полацку;
4) Гродна.

73. Мэтай шляхецкага паўстання 1830–1831 гг. было:
1) аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.;
2) аднаўленне ВКЛ;
3) ўсталяванне ў Расійскай імперыі канстытуцыйнай манархіі;
4) усталяванне ў Расіі рэспубліканскага ладу.

74. “Дэмакратычнае таварыства” дзейнічала ў:
1) Віленскім універсітэце;
2) Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі;
3) Свіслацкай гімназіі;
4) Віленскай духоўнай семінарыі.

75. Віленскі генерал-губернатар, які падавіў паўстанне 1863 г. у Літве і на Беларусі, – гэта:
1) У. Назімаў;
2) М. Навасільцаў;
3) М. Мураўёў;
4) П. Сталыпін.

76. Упершыню ідэя пра існаванне самастойнага беларускага этнасу і яго права на нацыянальную аўтаномію ў складзе будучай расійскай рэспублікі была абгрунтавана:
1) К. Каліноўскім;
2) удзельнікамі групы “Гоман”;
3) прыхільнікамі “заходнерусізму”;
4) сябрамі БСГ.

77. Галоўным у І і ІІ Думах было:
1) аграрнае пытанне;
2) рабочае пытанне;
3) фінансавае пытанне;
4) нацыянальнае пытанне.

78. Карэнныя змяненні, пераварот у грамадска-палітычным ладзе, які азначае звяржэнне старога і ўстанаўленне новага дзяржаўнага ладу – гэта:
1) рэвалюцыя;
2) змова;



Витебский государственный технологический университет

3) паўстанне;
4) рэформа.

79. Ператварэнне, змяненне, перабудова якога-небудзь боку грамадскага жыцця пры захаванні асноў існуючага ладу – гэта:
1) змова;
2) рэформа;
3) паўстанне;
4) рэвалюцыя.

80. Самастойнае ажыццяўленне дзяржаўнай улады або шырокае ўнутранае самакіраванне, якое прадастаўляецца асобнай нацыянальнасці, што кампактна пражывае ў межах дзяржавы – гэта:
1) незалежнасць;
2) аўтаномія;
3) федэрацыя;
4) саюз.

81. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая прыняла пастанову аб стварэнні Рабоча-сялянскага урада і абвяшчэнні ССРБ, адбылася 30–31 снежня 1918 г. у:
1) Маскве;
2) Мінску;
3) Смаленску;
4) Вільні.

82. Маніфест Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі аб утварэнні ССРБ быў прыняты:
1) 31 снежня 1918 г.;
2) 1 студзеня 1919 г.;
3) 5 студзеня 1919 г.;
4) 16 студзеня 1919 г.

83. Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі ўзначаліў:
1) З.Ф. Жылуновіч;
2) В.Ю. Ластоўскі;
3) А.Ф. Мяснікоў;
4) К.І. Ландар.

84. ЛітБелССР была ўтворана ў лютым:
1) 1918 г.;
2) 1919 г.;
3) 1920 г.;
4) 1921 г.

Витебский государственный технологический университет

85. Рыжскі мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Польшчай быў падпісаны ў:
1) сакавіку 1920 г.;
2) жніўні 1920 г.;
3) студзені 1921 г.;
4) сакавіку 1921 г.

86. Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік быў утвораны:
1) 30 снежня 1921 г.;
2) 30 снежня 1922 г.;
3) 30 снежня 1923 г.;
4) 30 снежня 1924 г.

87. Узбуйненні БССР адбыліся ў:
1) 1922 і 1924 гг.;
2) 1924 і 1925 гг.;
3) 1924 і 1926 гг.;
4) 1926 і 1928 гг.

88. Па Канстытуцыі БССР 1937 г. вышэйшым органам улады з'яўляўся:
1) Усебеларускі з'езд Саветаў;
2) Вярхоўны Савет;
3) СНК БССР;
4) ЦВК БССР.

89. Чырвоная Армія пачала паход на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў:
1) верасні 1939 г.;
2) кастрычніку 1939 г.;
3) лістападзе 1939 г.;
4) снежні 1939 г.

90. Свой першы залп "кацюшы" далі пад:
1) Віцебскам;
2) Мінскам;
3) Оршай;
4) Бабруйскам.

91. В.З. Харужая з'ўлялася адным з кіраўнікоў партыйнага падполля ў:
1) Віцебску;
2) Магілёве;
3) Мінску;
4) Оршы.

Витебский государственный технологический университет

92. Вёска Хатынь была спалена разам з жыхарамі ў:
1) 1941 г.;
2) 1942 г.;
3) 1943 г.;
4) 1944 г.

93. Адзін са стваральнікаў Расонскага партыйна-камсамольскага падполля, камандзір партызанскага атрада, у даваенны час настаўнік фізікі і матэматыкі:
1) В. Корж;
2) М. Шмыроў;
3) П. Мазураў;
4) П. Машэраў.

94. "Суражскія вароты" былі ўтвораны ў:
1) 1941 г.;
2) 1942 г.;
3) 1943 г.;
4) 1944 г.

95. Беларускі штаб партызанскага руху быў створаны ў:
1) 1941 г.;
2) 1942 г.;
3) 1943 г.;
4) 1944 г.

96. Першы абласны цэнтр Беларусі, вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў – гэта:
1) Віцебск;
2) Гомель;
3) Магілёў;
4) Гродна.

97. Апошні абласны цэнтр Беларусі быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:
1) 26 чэрвеня 1944 г.;
2) 3 ліпеня 1944 г.;
3) 28 ліпеня 1944 г.;
4) 7 жніўня 1944 г.

98. БССР падпісала статут ААН у:
1) 1944 г.;
2) 1945 г.;
3) 1948 г.;
4) 1955 г.

Витебский государственный технологический университет

99. Званне “Горад-герой” Мінск атрымаў у:
1) 1968 г.
2) 1974 г.
3) 1978 г.
4) 1980 г.

100. Беларускі мастак, аўтар серыі карцін “Лічбы на сэрцы”:
1) М. Савіцкі;
2) І. Шамякін;
3) Г. Вашчанка;
4) В. Волкаў.

101. М.У. Гусараў, М.С. Патолічаў, К.Т. Мазураў – гэта:
1) акцёры;
2) пісьменнікі;
3) першыя сакратары ЦК КПБ;
4) мастакі.

102. З 1965 па 1980 гг. Кампартыю Беларусі ўзначальваў:
1) П.М. Машэраў;
2) К.Т. Мазураў;
3) П.К. Панамарэнка;
4) В.Ф. Купрэвіч.

103. Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС адбылася 26 красавіка:
1) 1980 г.;
2) 1982 г.;
3) 1986 г.;
4) 1990 г.

104. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР была прынята:
1) 27 ліпеня 1990 г.;
2) 19 верасня 1991 г.;
3) 15 сакавіка 1994 г.;
4) 10 ліпеня 1994 г.

105. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР набыла статус канстытуцыйнага закона:
1) 27 ліпеня 1990 г.;
2) 25 жніўня 1991 г.;
3) 15 сакавіка 1994 г.;
4) 10 ліпеня 1994 г.

Витебский государственный технологический университет

106. Новая назва дзяржавы – “Рэспубліка Беларусь” – і новая дзяржаўная сімволіка былі зацверджаны:
1) 27 ліпеня 1990 г.;
2) 19 верасня 1991 г.;
3) 15 сакавіка 1994 г.;
4) 10 ліпеня 1994 г.

107. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь была прынята:
1) 27 ліпеня 1990 г.;
2) 19 верасня 1991 г.;
3) 15 сакавіка 1994 г.;
4) 10 ліпеня 1994 г.

108. А.Р. Лукашэнка ўпершыню быў абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь ў:
1) снежні 1991 г.;
2) лістападзе 1993 г.;
3) маі 1994 г.;
4) ліпені 1994 г.

109. Звання “Герой Беларусі” першым быў удастоены:
1) П. Клімук;
2) М. Чаргінец;
3) У. Карват;
4) У. Мулявін.

110. Верхняй палатай беларускага парламента з’яўляецца:
1) Нацыянальны сход;
2) Савет Рэспублікі;
3) Палата прадстаўнікоў;
4) Вярхоўны Савет.

111. Ніжняй палатай беларускага парламента з’яўляецца:
1) Савет Рэспублікі;
2) Нацыянальны сход;
3) Вярхоўны Савет;
4) Палата прадстаўнікоў.

112. Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі быў падпісаны:
1) 2 красавіка 1996 г.;
2) 2 красавіка 1997 г.;
3) 8 снежня 1999 г.;
4) 15 кастрычніка 2001 г.

Витебский государственный технологический университет

113. Рэферэндум, на які выносілася пытанне аб устанаўленні новых Дзяржаўнага сцяга і Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, адбыўся:
1) 14 мая 1995 г.;
2) 24 лістапада 1996 г.;
3) 24 мая 1998 г.;
4) 17 кастрычніка 2004 г.

114. Дзень незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) святкуецца:
1) 15 сакавіка;
2) 25 сакавіка;
3) 3 ліпеня;
4) 27 ліпеня.

Витебский государственный технологический университет

## ПЕРАЛІК РЭФЕРАТАЎ

1. Адметныя старонкі гісторыі маёй малой радзімы (пра месца (горад, вёску) свайго нараджэння)).
2. Дзяржава як асноўны палітычны інстытут.
3. Білінгвізм – характэрная рыса сучаснай беларускай нацыі.
4. Культура ў Вялікім Княстве Літоўскім.
5. "Гоман" і дзейнасць беларускіх народнікаў.
6. Дасягненні і трагедыі савецкай эпохі.
7. Памяць пра Вялікую Айчынную вайну вечна жыве ў нашых сэрцах (на прыкладзе сваёй сям'і).
8. Распад СССР і яго прычыны.
9. Этнічны склад сучаснай Беларусі.
10. Гісторыя і сімвалічнае значэнне Дзяржаўнага сцяга.
11. Усебеларускія народныя сходы і іх роля.
12. Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі.
13. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.
14. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь як гарант канстытуцыі, правоў і свабод грамадзян.
15. Веча і сойм як правобраз парламента.
16. Роля палітычных партый у развіцці дзяржавы.
17. Функцыі і паўнамоцтвы мясцовых органаў кіравання і самакіравання.

Витебский государственный технологический университет

## ЛІТАРАТУРА ДЛЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ


1. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 1 : Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2018. – 598 с.

2. История белорусской государственности : 5 т. Т. 2. Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в.) / Н. В. Смехович [и др.] ; отв. ред. тома: Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 432.

3. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 4. Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939–1953 гг.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома Н. Б. Нестерович ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 567 с.

4. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 5. Национальная государственность на переломе эпох (вторая половина XX – начало XXI в.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. тома Н. В. Смехович ; Национальная академия наук Беларуси, Институт истории. – Минск : Беларуская навука, 2020. – 759 с.

5. Коваленя, А. А. История белорусской государственности : в 5 т. Т. 3. Белорусская государственность : от идеи к национальному государству (1917–1939 гг. ) / А. А. Коваленя [и др.]; отв. ред. тома : В. Г. Мазец, Н. В. Смехович, С. А. Третьяк. – Минск : Беларуская навука, 2019. – 639 с.

6. История Беларуси в контексте европейской цивилизации : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования / С. А. Елизаров, Е. П. Нарижная, З. А. Неверова, С. А. Юрис. – 2-е изд., испр. – Минск : Вышэйшая школа, 2016.

7. История Беларуси : курс лекций для студентов заочной формы обучения / В. Е. Бездель, А. А. Субботин, В. М. Хаданёнак. – Витебск : УО “ВГТУ”, 2012.

8. Каханоўскі, А. Г. Гісторыя Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 251 с.

9. Новик, Е. К. История Беларуси. С древнейших времен до 2012 года : учебное пособие для студентов вузов / Е. К. Новик, И. Л. Качалов, Н. Е. Новик ; под ред. Е. К. Новика. – Минск : Вышэйшая школа, 2012.

10. Проблемы формирования белорусской государственности в XX – начале XXI века : избранные труды Н. С. Сташкевича / под науч. ред. А. Н. Данилова, В. С. Кошелева. – Минск : РИВШ, 2012. – 240 с.

11. Становление и развитие белорусской государственности / А. Г. Кохановский [и др.]. – Минск : Белорусский государственный университет, 2011. – 42 с.


Витебский государственный технологический университет

Вучэбнае выданне

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Рабочы сшытак

Укладальнік:
Хаданёнак Віктар Мамертавіч

Рэдактар *Т.А. Осіпава*
Карэктар *А.В. Пухальская*
Камп'ютарная вёрстка *В.С. Гармазава*

Падпісана да друку 22.09.2022. Фармат 60x90 1/16. Ум. выд. аркушаў 10,9.
Ул-выд. арк. 13,8. Тыраж 400 экз. Заказ 259.

Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт"
210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 72.
Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/172 ад 12.02.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 3/1491 ад 30.05.2017.

Витебский государственный технологический университет